Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 5 (134), 2022

*УДК 796.011.2*

# Анталогія алімпійскай дзейнасці

У.М. Старчанка

У артыкуле раскрываецца анталогія алімпійскай дзейнасці як працэсу матэрыялізацыі алімпійскай ідэі. Прадстаўлена анталагічная схема алімпійскай дзейнасці і яе элементаў: мыслядзейнасці і практычнай дзейнасці. Дана схема пашырагага ўзнаўлення алімпійскай дзейнасці. Указаны месцы і апісаны функцыі алімпійскай ідэі, алімпійскага руху, алімпійскай культуры ў алімпійскай дзейнасці.
**Ключавыя словы:** алімпійская дзейнасць, алімпійская ідэя, алімпійскі рух, алімпійская культура, алімпійская мыслядзейнасць, алімпійская практычная дзейнасць, анталогія.

The article reveals the ontology of Olympic activity as a process of materialization of the Olympic idea. The ontological scheme of Olympic activity and its elements is presented: mental activity and practical activity. The scheme of expanded reproduction of Olympic activity is given. The places and the functions of the Olympic idea, Olympic movement, Olympic culture are indicated in the Olympic activity.
**Keywords:** Olympic activity, Olympic idea, Olympic movement, Olympic culture, Olympic mental activity, Olympic practical activity, ontology.

**Уводзіны**. Актуальнасць праблемы распрацоўкі даследчыкам алімпійскай дзейнасці яе анталогіі ўяўляецца відавочнай. Гэта абумоўлена тым, што даследаванне алімпійскай дзейнасці патрабуе наяўнасці тэарэтычнай канструкцыі, якая адлюстроўвае анталагічныя прадстаўленні аб ёй у выглядзе сутнастнай структурна-функцыянальнай мадэлі, якая павінна выступаць у якасці працоўнага інструментарыя даследчыка. Нам уяўляецца, што распрацоўка структурна-функцыянальнай мадэлі алімпійскай дзейнасці магчымая з пазіцый сістэмадзейнаснага падыходу, шырока прадстаўленага ў сучаснай педагагічнай навуцы [1]–[4].

**Мэтай** нашай работы была распрацоўка і апісанне структурна-функцыянальнай мадэлі алімпійскай дзейнасці.

Дасягненне мэты было спалучана з вырашэннем наступных **задач**:

– даць вызначэнне алімпійскай дзейнасці з пазіцыі сістэмадзейнаснага падыходу;
– распрацаваць структурна-функцыянальную мадэль алімпійскай дзейнасці;
– указаць месцы і апісаць функцыі структурных элементаў і працэсаў алімпійскай дзейнасці.

**Методыка** праведзенага намі тэарэтычнага даследавання ляжала ў паслядоўным выкарыстанні сістэмадзейнаснага падыходу, метадаў аналізу, сінтэзу, мадэлявання падчас распрацоўкі анталагічнай структурна-функцыянальнай мадэлі алімпійскай дзейнасці.

**Ход і вынікі даследавання.** Алімпійская дзейнасць у сістэмадзейнасным падыходзе прадстаўляе сабой працэс матэрыялізацыі алімпійскай ідэі алімпійскім рухам з выкарыстаннем алімпійскай культуры [5]. Алімпійская дзейнасць у выглядзе анталагічнай схемы прадстаўлена на малюнку 1.

Схема (мадэль) не толькі паказвае на структурныя элементы алімпійскай дзейнасці (алімпійская ідэя, алімпійскі рух, алімпійская культура), але працэсуальна раскрывае яе механізм.

Алімпійская ідэя ствapae алімпійскі рух, авалодвае ім і пры яго пасрэдніцтве матэрыялізуецца ў алімпійскай культуры, якая з’яўляецца не толькі вынікам алімпійскай дзейнасці, але і сродкам з дапамогай якога алімпійскі рух ажыццяўляе алімпійскую дзейнасць. Алімпійская культура выступае як сталае адзінства алімпійскай ідэі і сацыяльна-прыроднага матэрыялу, на якім яна матэрыялізавалася.

Па законах сістэмы трансфармацыя аднаго з элементаў сістэмы (алімпійскай культуры) у сваю чаргу выклікае трансфармацыю алімпійскай ідэі і алімпійскага руху, што непазбежна выклікае да жыцця новы акт алімпійскай дзейцнасці, у якім абноўленая алімпійская ідэя пры пасрэдніцтве абноўленага і ўзброенага новымі культурнымі сродкамі алімпійскага руху матэрыялізуецца ў абноўленай алімпійскай культуры. Гэтак адбываецца алімпійскае развіццё, якое можа быць прадстаўлена як працэс пашыранага ўзнаўлення алімпійскай дзейнасці.




Малюнак 1 – Схема алімпійскай дзейнасці

Такім чынам, алімпійская дзейнасць паступова, але няўхільна захоплівае ўсё больш складаныя структуры ідэальнага двухмернага свету (развівае алімпійскую ідэю), пры пасрэдніцтве ўзброенага алімпійскай культурай калектыўнага носьбіта алімпійскай ідэі і дзейнасці (алімпійскага руху) накладае іх як матрыцу на трохмерны матэрыяльны (у тым ліку і сацыяльны) свет і структурыруе яго ў адпаведнасці з ёй. Так ствараецца новая больш складаная алімпійская культура, якая ў сваю чаргу абнаўляе і паглыбляе не толькі алімпійскую ідэю, але і алімпійскі рух.

Далейшае раскрыццё анталогіі алімпійскай дзейнасці патрабуе прад'яўлення механізмаў фармавання алімпійскай культуры і яе ўздзеяння на алімпійскую ідэю і алімпійскі рух. Для гэтага давядзецца па іншаму прадставіць схему алімпійскай дзейнасці і раскласці апошнюю на два ўзаемазвязаныя структурна-функцыянальныя элементы: алімпійскую мыслядзейнасць і практычную алімпійскую дзейнасць (малюнак 2).




Малюнак 2 – Алімпійская дзейнасць складае своеасаблівы «ланцуг» з практычнай алімпійскай дзейнасці і алімпійскай мыслядзейнасці

Пры гэтым алімпійская мыслядзейнасць вызначаецца намі як абумоўлены алімпійскай культурай і ажыццяўляемы пры пасярэдніцтве алімпійскага руху працэс фармавання ідэальнага кампанента алімпійскай культуры. А алімпійская практычная дзейнасць – як абумоўлены алімпійскай культурай і ажыццяўляемы пры пасрэдніцтве алімпійскага руху працэс фармавання матэрыяльнага кампанента алімпійскай культуры.

Сумяшчэнне двух прад'яўленых вышэй анталагічных малюнкаў алімпійскай дзейнасці дае наступную разгорнутую анталагічную схему алімпійскай дзейнасці (малюнак 3).




Малюнак 3 – Разгорнутая анталагічная схема алімпійскай дзейнасці

Адпаведна схеме, ідэальную частку алімпійскай культуры фармуе алімпійская мыслядзейнасць, вынікам якой з'яўляюцца атрымаўшыя актуальнае жыццё ідэальныя алімпійскія сутнасці: алімпійскія веды, спосабы алімпійскага мыслення і практычнай дзейнасці, ідэальныя ўзоры алімпійскай мыслядзейнасці, літаратурныя і мастацкія эманацыі алімпійскай ідэі, алімпійская ідэялогія, алімпійскія праекты, канцэпцыі і тэорыі, алімпійскія каштоўнасці, нормы, прыватныя думкі і меркаванні ўдзельнікаў алімпійскага руху, грамадскія і індывідуальныя ўяўленні аб алімпійскай дзейнасці і алімпійцах. Матэрыяльную частку алімпійскай культуры фармуе практычная алімпійская дзейнасць, вынікам якой з'яўляюцца матэрыяльныя носьбіты адпаведных ідэальных алімпійскіх сутнасцяў: алімпійцы як носьбіты алімпійскай ідэі, кнігі аб алімпійскай дзейнасці, ідэалогіі руху і культуры, лазерныя дыскі з алімпійскімі энцыклапедыямі, алімпійскія спартыўныя пабудовы, алімпійская матэрыяльная інфраструктура, будынкі і экспазіцыі музеяў алімпійскай славы, алімпійская сімволіка, алімпійскі спартыўны інвентар, алімпійскія медалі, узнагароды і сувеніры.

Аднак алімпійская культура з'яўляецца не толькі вынікам, але і сродкам алімпійскай дзейнасці. Прычым ідэальная частка алімпійскай культуры выступае як сродак алімпійскай мыслядзейнасці алімпійскага руху, а матэрыяльная – як сродак практычнай алімпійскай дзейнасці алімпійскага руху. Вось чаму ўсякае абнаўленне алімпійскай культуры ў працэсе алімпійскай дзейнасці цягне за сабой абнаўленне алімпійскай ідэі і алімпійскага руху, што ў сваю чаргу ініцыюе новы акт абноўленай алімпійскай дзейнасці.

Адзначым, што анталагічная схема алімпійскай дзейнасці прадугледжвае існаванне трох структурна-функцыянальных месцаў (алімпійская ідэя, алімпійскі рух, алімпійская культура) і двух працэсаў (алімпійская мыслядзейнасць і практычная алімпійская дзейнасць). Што тычыцца вылучэння ў асобны топ схемы матэрыяльнай субстанцыі, то гэта зроблена намі толькі для зручнасці адлюстравання прынцыпу работы схемы і спрашчэння яе ўспрымання чытачом, які непазбежна падыходзіць да яе прачытання з антрапацэнтрычнай пазіцыі. З паслядоўна дзейнаснай пазіцыі нельга заўважыць апазіцыю «штучнае – натуральнае» або «прыроднае – культурнае», бо яны зліваюцца ў адно. З гэтай пазіцыі топы «алімпійская культура» і «матэрыяльная субстанцыя» адно – алімпійская культура (малюнак 1). З гэтай пазіцыі алімпійскі рух непасрэдна працуе з культурай (структараванай першаснымі агентамі і чалавекам матэрыяй).

Прадстаўленая вышэй разгорнутая схема алімпійскай дзейнасці раскрывае яе анталогію і выкарыстоўвалася намі ў якасці мадэлі-канфігуратара, з дапамогай якой праводзілася сістэмнае сумяшчэнне паліпрадметных ведаў як аб самой алімпійскай дзейнасці, гэтак і аб яе структурных элементах. Далей мы выкарысталі анталагічную схему алімпійскай дзейнасці для сістэмнага апісання кожнага з трох галоўных яе элементаў, для чаго «выварочвалі» схему з пазіцыі гэтых элементаў.

Для пачатку вызначым месца і функцыі ***алімпійскай ідэі*** ў алімпійскай дзейнасці. Алімпійская ідэя – нематэрыяльная, ідэальная рэальнасць, якая авалодвае алімпійскім рухам, аб'ядноўвае і структуруе яго, якая тэлеалагічна задае накірунак яго алімпійскай дзейнасці [6]. Алімпійская ідэя выступае як ідэальная сутнасць двухмернага свету, якая задае пачатак і накірунак алімпійскай дзейнасці, задае яе мэту. У алімпійскай дзейнасці алімпійская ідэя займае месца арганізуючага пачатку, ініцыятара, каталізатара і рэгулятара дзейнасці. Для сваёй матэрыялізацыі (рэалізацыі) ідэі патрэбны агент-пасрэднік. Таму алімпійская ідэя праз механізм алімпійскай мыслядзейнасці пачынае актуальна існаваць на сацыяльна арганізаваным чалавечым матэрыяле, гэтак яна стварае алімпійскі рух (мабілізуе людзей – носьбітаў алімпійскай ідэі), авалодвае ім, структуруе і арганізоўвае яго дзейнасць. Алімпійская ідэя матэрыялізуецца ў алімпійскай культуры як яе ідэальная, але прывязаная да матэрыяльных носьбітаў частка. У гэтай сваёй якасці яна прыдатная да капіравання, распаўсюджвання, перадачы-засваення (трансляцыі) і сацыяльнага ўзнаўлення. Праз алімпійскую культуру алімпійская ідэя авалодвае новымі носьбітамі і транслюецца з пакалення ў пакаленне, гэта значыць існуе як гістарычны феномен.

Алімпійская ідэя актуальна існуе для чалавека толькі як звязаная з пэўным матэрыяльным субстратам, як ідэальная структура, накладзеная на пэўны матэрыял, кажучы інакш – як культурны феномен. Пры тым ступень матэрыялізацыі алімпійскай ідэі можа быць рознай, бо ў сваёй завершанай паўнаце яна не можа матэрыялізавацца адразу, а толькі паступова, хоць і стахастычна-непаслядоўна (ад прасцейшых праяваў да ўсё больш складаных і разгорнутых эманацый). Таму

можна гаварыць аб развіцці алімпійскай ідэі як аб незваротным, мэтанакіраваным і заканамерным мыслядзейнасным працэсе, у які ўцягнуты носьбіты алімпійскай ідэі і які ажыццяўляецца пры дапамозе алімпійскай культуры, якая выступае як сродак алімпійскай мыслядзейнасці.

Матэрыялізацыя ў культуры ўсё больш складаных эманацый алімпійскай ідэі дазваляе выкарыстоўваць іх у працэсе мыслядзейнасці ў якасці больш эфектыўных сродкаў, што вядзе да спараджэння яшчэ больш складаных і разгорнутых яе ідэальных праяваў, якія ў сваю чаргу матэрыялізуюцца ў алімпійскай культуры. Гэтак ажыццяўляецца пашыранае ўзнаўленне (развіццё) алімпійскай ідэі.

У звязку з алімпійскай ідэяй існуе алімпійская ідэялогія, пад якой мы разумеем сукупнасць ідэй, якія разам з алімпійскай ідэяй актуальна матэрыялізуюцца ў працэсе рэальнай алімпійскай дзейнасці. Справа ў тым, што алімпійская дзейнасць у працэсе свайго развіцця дыферэнцыруецца на асобныя віды і падвіды, якія абслугоўваюць тыя ці іншыя яе аспекты. Аднак кожны від або падвід дзейнасці – гэта працэс матэрыялізацыі асобнай ідэі. Так, у працэсе алімпійскай дзейнасці пад эгідай алімпійскай ідэі матэрыялізуецца адкрытая сукупнасць сістэмна звязаных з ёй ідэй. Акрамя таго, практыка сведчыць, што ў працэсе алімпійскай дзейнасці могуць матэрыялізоўвацца ідэі, якія з алімпійскай ідэяй звязаны не сістэмна, а эклектычна, выпадкова і нават канкурэнтна. Тым не менш, яны традыцыйна (або эпізадычна) уваходзяць у алімпійскую ідэалогію, негледзячы на тое, што могуць перашкаджаць алімпійскай дзейнасці [6], [7].

З функцыянаваннем алімпійскай ідэі і існаваннем адпаведнай ёй ідэялогіі звязана існаванне алімпійскіх каштоўнасцяў. Ідэі, якія актуальна матэрыялізуюцца ў працэсе алімпійскай полідзейнасці, знаходзяцца ў стане канкурэнтнай барацьбы, бо кожная ідэя імкнецца аднаасобна авалодаць носьбітамі і матэрыялізавацца ў максімальнай ступені. З гэтай прычыны для нармальнага ажыццяўлення менавіта алімпійскай дзейнасці, як полідзейнасці павінна існаваць сістэма прыярытэтаў. Алімпійскія каштоўнасці і задаюць гэтую сістэму прыярытэтаў, задаюць іерархію ідэй у алімпійскай дзейнасці. Алімпійскія каштоўнасці могуць існаваць як сістэма прынцыпаў, якія рэгламентуюць алімпійскую дзейнасць і зберагаюць яе ад спустошвання і перараджэння.

Цяпер вызначым месца і функцыі ***алімпійскага руху*** ў алімпійскай дзейнасці. Алімпійскі рух у алімпійскай дзейнасці займае спецыфічнае месца агента-пасрэдніка, носьбіта гэтай дзейнасці. Алімпійскі рух выступае як калектыўны агент-носьбіт алімпійскай дзейнасці, носьбіт алімпійскай ідэі і творца алімпійскай культуры.

Алімпійскі рух узнікае і арганізуецца тады, калі ў соцыуме ўзнікаюць носьбіты алімпійскай ідэі. З гэтага моманту ўзнікае неабходнасць і магчымасць алімпійскай дзейнасці.

Функцыянальна алімпійскі рух ажыццяўляе цэласную алімпійскую дзейнасць, а менавіта – алімпійскую мыслядзейнасць і практычную алімпійскую дзейнасць. Вынікам яго дзейнасці з’яўляецца алімпійская культура, якую ён выкарыстоўвае ў якасці сродка дзейнасці.

Алімпійскі рух як рух сацыяльны складаецца са шматлікіх сацыяльных адзінак – людзей, якія займаюць у ім розныя сацыяльныя пазіцыі і выконваюць розныя функцыі. Алімпійскі рух іманентна схільны да сацыяльнай дыферэнцыяцыі і структуравання сваіх удзельнікаў у звязку з аналагічнымі працэсамі дыферэнцыяцыі самой алімпійскай дзейнасці на віды і падвіды. У прыватнасці адны групы ўдзельнікаў алімпійскага руху займаюцца пераважна алімпійскай мыслядзейнасцю, а іншыя – практычнай алімпійскай дзейнасцю. Аднак трэба ўлічваць, што падзяленне алімпійскай дзейнасці на мыслядзейнасць і практычную дзейнасць настолькі ўмоўнае, што ў рэальнасці наўрад ці атрымаецца адшукаць чыстых пазіцыянераўносьбітаў названых падвідаў алімпійскай дзейнасці.

Алімпійскі рух іманентна імкнецца да пашырэння (экспансіі) шляхам трансляцыі алімпійскай ідэі на соцыум, што пастаўляе яму ўсё новых і новых адэптаў. Для дасягнення гэтай мэты алімпійскі рух стварае спецыяльныя механізмы трансляцыі і ўзнаўлення алімпійскай культуры з выкарыстаннем разнастайных форм сацыяльнай камунікацыі.

Што тычыцца месца і функцыі ***алімпійскай культуры*** ў алімпійскай дзейнасці, то яна займае месца выніку і сродку, што і вызначае яе функцыі. Яна тое, што ствараецца, і тое, што выкарыстоўваецца для свайго стварэння. Гэткім чынам, алімпійская культура двума спосабамі ўключана ў алімпійскую дзейнасць. Па-першае, яна ёсць матэрыялізаваная алімпійская ідэя (вынік), па-другое, яна матэрыял алімпійскай дзейнасці (сродак). Прычым ідэальная частка алімпійскай культуры выступае як вынік і сродак алімпійскай мыслядзейнасці алімпійскага руху, а матэрыяльная – як вынік і сродак практычнай алімпійскай дзейнасці алімпійскага руху [8].

Апісаны вышэй феномен патрабуе тлумачэнняў. Узнікшая ў выніку мыслядзейнасці канкрэтная эманацыя алімпійскай ідэі пры пасрэдніцтве алімпійскага руху матэрыялізуецца ў алімпійскай культуры (ідэальная ідэя-матрыца пераструктуруе пэўны матэрыяльны субстрат і звязваецца з ім). Цяпер гэтая эманацыя алімпійскай ідэі пачынае актуальна і ў даступнай для спажывання форме існаваць для соцыуму, і можа быць ім скарыстана ў працэсе далейшай дзейнасці. У прыватнасці ўжо матэрыялізаваная ў культуры ідэя можа быць выкарыстана як сродак мыслядзейнасці, што спараджае новую больш складаную і разгорнутую эманацыю алімпійскай ідэі, якая колькасна-якасна адрозніваецца ад той, якая была выкарыстана ў якасці сродку, бо вынік дзейнасці заўсёды большы за яе сродак. З другога боку, звязаная з ідэальнай часткай матэрыяльная частка культуры можа быць выкарыстана для практычнай дзейнасці з аналагічным эфектам.

Такім чынам, алімпійская культура звязвае ў адзіны ланцуг алімпійскую мыслядзейнасць і практычную дзейнасць і забяспечвае пашыранае ўзнаўленне алімпійскай дзейнасці – алімпійскае развіццё.

Цяпер звернемся да аналізу і апісання працэсуальных арганізаванасцяў алімпійскай дзейнасці: мыслядзейнасці і практычнай дзейнасці.

***Алімпійская мыслядзейнасць*** на схеме алімпійскай дзейнасці займае месца працэсуальна арганізаванай сувязі паміж алімпійскай ідэяй і алімпійскім рухам.

Алімпійская мыслядзейнасць – гэта абумоўлены алімпійскай культурай і ажыццяўляемы пры пасрэдніцтве алімпійскага руху працэс развіцця алімпійскай ідэі і фармавання ідэальнага кампанента алімпійскай культуры. Алімпійская мыслядзейнасць працэсуальна звязвае паміж сабой такія арганізаванасці алімпійскай дзейнасці, як алімпійская ідэя і алімпійскі рух. Без алімпійскай мыслядзейнасці такая сувязь была б немагчыма. Адсюль і яе функцыі ў алімпійскай дзейнасці – пашыранае ўзнаўленне (развіццё) алімпійскай ідэі і «звязванне» яе з алімпійскім рухам.

Мыслядзейнасць можа быць прадстаўлена як працэс барацьбы ідэальных сутнасцяў двухмернага свету за агента дзейнасці. Алімпійская мыслядзейнасць – як працэс барацьбы розных эманацый алімпійскай ідэі за алімпійскі рух. Прычым гэта барацьба вядзецца па правілах, якія задаюцца логікай (фармальнай, дыялектычнай, зместава-генетычнай...) і алімпійскімі каштоўнасцямі.

У працэсе мыслядзейнасці выкарыстоўваюцца разнастайныя ідэальныя сродкі: спосабы і логікі мыслення, розныя навуковыя падыходы і метады, канцэпцыі, прынцыпы і правілы, анталагічныя схемы і веды. Выкарыстанне тых ці іншых сродкаў прама ўплывае на эфектыўнасць і вынікі мыслядзейнасці. Прычым гэтыя сродкі бяруцца з культуры і вяртаюцца ў культуру, але вяртаюцца не такімі, як былі, а ў абноўленым выглядзе, бо таксама з’яўляюцца аб’ектам мыслядзейнасці.

***Алімпійская практычная дзейнасць*** на схеме алімпійскай дзейнасці займае месца працэсуальна арганізаванай сувязі паміж алімпійскім рухам і матэрыяльным субстратам трохмернага свету. Адпаведна гэтаму месцу алімпійская практычная дзейнасць выступае як абумоўлены алімпійскай культурай і ажыццяўляемы пры пасрэдніцтве алімпійскага руху працэс фармавання матэрыяльнага кампанента алімпійскай культуры.

Алімпійская практычная дзейнасць працэсуальна звязвае паміж сабой такія арганізаванасці алімпійскай дзейнасці, як алімпійскі рух і матэрыя. Без алімпійскай практычнай дзейнасці такая сувязь была б немагчыма. Адсюль і яе функцыі ў алімпійскай дзейнасці – пашыранае ўзнаўленне (развіццё) алімпійскай культуры і «звязванне» яе з алімпійскім рухам.

Практычная алімпійская дзейнасць можа быць прадстаўлена як працэс пераструктуравання алімпійскім рухам матэрыяльнага свету ў адпаведнасці з алімпійскай ідэяй, якая выступае ў ролі ідэальнай матрыцы-структуры. Паспяховая практычная алімпійская дзейнасць мае сваім вынікам матэрыяльную частку алімпійскай культуры, якая ўключае ў сябе структурна перааформленую ў адпаведнасці з алімпійскай ідэяй матэрыяльную субстанцыю. Алімпійская ідэя матэрыялізуецца ў алімпійскай культуры як яе ідэальная, але звязаная з матэрыяльным носьбітам частка.

У працэсе практычнай алімпійскай дзейнасці выкарыстоўваюцца разнастайныя матэрыяльныя сродкі, якія запазычваюцца з культуры і вяртаюцца ў культуру. Але вяртаюцца яны ў культуру ў абноўленым выглядзе, бо самі з’яўляюцца аб’ектам практычнай дзейнасці.

Нагадаем, што з паслядоўна дзейнаснай пазіцыі культура (штучнае) і матэрыяльная субстанцыя (натуральнае) зліваюцца ў адно – культуру. З гэтай пазіцыі алімпійскі рух непас-

рэдна працуе з культурай (структараванай першаснымі агентамі і чалавекам матэрыяй). Толькі з антрапацэнтрычнай пазіцыі можна падзяляць матэрыяльную субстанцыю на натуральную (прырода) і штучную (культура).

Прад'яўленая намі анталагічная структурна-функцыянальная мадэль алімпійскай дзейнасці, як ужо паказана вышэй, можа выкарыстоўвацца ў якасці мадэлі-канфігуратара, а таксама для стварэння план-карты сістэмнага даследавання алімпійскай дзейнасці.

**Высновы**.

1. Алімпійская дзейнасць у сістэмадзейнасным падыходзе прадстаўляе сабой працэс матэрыялізацыі алімпійскай ідэі алімпійскім рухам з выкарыстаннем алімпійскай культуры.

2. Анталагічная структурна-функцыянальная мадэль алімпійскай дзейнасці прадугледжвае існаванне трох структурна-функцыянальных месцаў (алімпійская ідэя, алімпійскі рух, алімпійская культура) і двух працэсаў (алімпійская мыслядзейнасць і практычная алімпійская дзейнасць). Мадэль апісвае структурныя элементы алімпійскай дзейнасці і працэсуальна раскрывае яе механізм.

3. Анталагічная схема алімпійскай дзейнасці прыдатна для выкарыстання ў якасці мадэлі-канфігуратара, з дапамогай якога можна ажыццяўляць сістэмнае сумяшчэнне поліпрадметных ведаў як аб самой алімпійскай дзейнасці, гэтак і аб яе структурных элементах, а таксама для стварэння план-карты сістэмнага даследавання алімпійскай дзейнасці.

## Літаратура

1. Анисимов, О. С. Язык теории деятельности: становление / О. С. Анисимов. – М., 2001. – 484 с.

2. Громыко, Ю. В. Мыследеятельностная педагогика (теоретико-практическое руководство по освоению высших образцов педагогического искусства) / Ю. В. Громыко. – Минск : Технопринт, 2000. – 376 с.

3. Щедровицкий, Г. П. Философия. Наука. Методология / Г. П. Щедровицкий. – М. : Школа культурной политики, 1997. – 656 с.

4. Старчанка, У. М. Сутнасць дзейнаснага падыходу і яго значэнне для педагагічнай тэорыі і практыкі / У. М. Старчанка // Становление социальной и профессиональной компетентности личности : рец. сб. науч. ст. / редкол.: Ф. В. Кадол (науч. ред.), В. П. Горленко (отв. ред.), Л. И. Селиванова ; М-во образования Респ. Беларусь, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф Скорины, 2012. – С. 95–102.

5. Старченко, В. Н. Состав и содержание категориального аппарата исследователя олимпийского движения / В. Н. Старченко // Мир спорта. – 2013. – № 4 (53). – С. 33–37.

6. Старчанка, У. М. Алімпійская ідэя ў кантэксце алімпійскай дзейнасці / У. М. Старчанка // Взаємодія духовного й фізичного виховання в становленні гармонійно розвиненої особистості : збірник статей за матеріалами IV Міжн. науково-практичної онлайн-конференції, Слов'янськ, Україна, 23–24 березня 2017 р. : у 2 т. ; гол. ред. В. М. Пристинський. – Слов'янськ : ДВНЗ «Донбаський державний педагогічний університет», 2017. – Т. 2. – С. 414–421.

7. Столяров, В. И. Судьба гуманистического олимпийского проекта Кубертена в современном олимпийском движении / В. И. Столяров // Взаємодія духовного й фізичного виховання в становленні гармонійно розвиненої особистості : збірник статей за матеріалами IV Міжн. науково-практичної онлайн-конференції, Слов'янськ, Україна, 23–24 березня 2017 р. : у 2 т. ; гол. ред. В. М. Пристинський. – Слов'янськ : ДВНЗ «Донбаський державний педагогічний університет», 2017. – Т. 2. – С. 421–430.

8. Старченко, В. Н. Структурно-функциональная модель олимпийской культуры участника олимпийского движения / В. Н. Старченко // Мир спорта. – 2014. – № 3 (56). – С. 36–42.

Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

Поступила в редакцию 20.01.2022